# БІБЛІЯТЭКА ЯДНАЕ ЛЮДЗЕЙ

*Мая радзіма там,*
*дзе мая бібліятэка.*

**Эразм Ратэрдамскі**

***З адкрыццём новага будынка Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (НББ) у грамадстве ўсё часцей узгадваюцца супрацоўнікі "храмаў кніг". Чым сёння жывуць айчынныя бібліятэкі? Адказ на гэта пытанне шукалі ўдзельнікі прэс-канферэнцыі, якая прайшла напярэдадні 15 верасня — Дня бібліятэк.***



Намеснік міністра культуры Рэспублікі Беларусь Валерый Гедройц заўважыў, што наша краіна адпавядае нарматывам ЮНЕСКА па колькасці бібліятэк. У сістэме Міністэрства культуры працуе 4 215 падобных устаноў, па рэспубліцы іх налічваецца каля 10 000.

Нягледзячы на ўсе перыпетыі постсавецкага перыяду, колькасць карыстальнікаў паслугамі бібліятэк не зменшылася. А гэта каля 4 мільёнаў чалавек. З іх мільён — дзеці і падлеткі...

Валерый Карлавіч зазначыў, што ў апошні час у Беларусі спыніўся працэс закрыцця бібліятэк. Раней гэта тычылася дробных вёсачак, у якіх утрыманне такіх устаноў было немэтазгодным.

На паляпшэнне працы бібліятэк скіравана і новая рэдакцыя закона "Аб бібліятэчнай справе". Згодна з ім дзяржава мае прыярытэтнае права (пры роўных умовах) на пакупку рарытэтных кніг з прыватных калекцый, каб захаваць іх для нашчадкаў. Таксама закон надае асобы статус НББ. Аб гэтым паведаміла намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе Наталля Аўдзеева. Наталля Пятроўна звярнула ўвагу прысутных на тое, што да 2009 года агульныя выдаткі на культуру павінны скласці 1 працэнт ад валавога ўнутранага прадукта...

15 верасня — гэта не толькі прафесійнае свята, але і дзень

ліятэкі Беларусі. У "дыямент" у абсалютна рэкордны тэрмін (52 дні) было перамешчана каля 8 мільёнаў асобнікаў інфармацыйных рэсурсаў. "У сусветнай практыцы гэты працэс зацягваецца на гады," — заўважыў дырэктар НББ Раман Матульскі.

— З моманту адкрыцця "нацыяналкі", яе чытачамі сталі ўжо больш як 13 000 чалавек. Чытальныя залы наведалі каля 90 000 карыстальнікаў, — паведаміў Раман Сцяпанавіч.

За апошні час бібліятэку з экскурсіямі наведалі больш як 25 000 чалавек. Ацанілі яе веліч-насць ды зручнасць і ўдзельнікі разнастайных міжнародных, рэспубліканскіх форумаў. Насамрэч, бібліятэка яднае людзей!

**Сяргей ДУБОВІК**

***Фота аўтара***